Блізкая ўлада

# УВАГА ДА МАЁМАСНЫХ АДНОСІН, БІЗНЕСУ, ЗДАРОЎЯ

## Наталля КАЧАНАВА правяла чарговы прыём грамадзян

**Людзі прыходзяць на прыём да Старшыні Савета Рэспублікі Наталлі Качанавай пераважна пасля таго, як яны ўжо прайшлі пэўныя інстанцыі і не атрымалі адказу на пытанні, з якімі звярталіся, бо вераць, як неаднаразова даводзілася ад іх чуць, у яе чалавечнасць і справядлівасць. На прыёмы па асабістых пытаннях, якія праводзіць Наталля Качанава, як правіла, запрашаюцца службовыя асобы, кампетэнтныя ў рашэнні абазначаных праблем, а колькасць ахвотных трапіць на аўдыенцыю значна перавышае вызначаны на гэта ў рабочым графіку час. Тым не менш старшыня заўжды працуе, пакуль не выслухае ўсіх, і гэты прыём не стаў выключэннем.**



Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

Цікава, што некаторыя пытанні людзей вырашаюцца, варта ім толькі запісацца на прыём да Наталлі Качанавай. Двое заяўнікаў не прыйшлі менавіта з гэтай прычыны: пытанне аднаго ўрэгулявалі яшчэ да сустрэчы са старшынёй, а другому паабяцалі вырашыць намаганнямі ведамства, дзе працуе чалавек, які шукаў дапамогі на высокім узроўні.

— Часта мы нават не накіроўваем людзей далей, а вырашаем праблемы, якія ў іх узнікаюць, тут, на месцы, каб гэта было аператыўна і хутка. Аднак для сябе робім вывад, што нам трэба больш уважліва глядзець на заканадаўства, якое дзейнічае, і тыя нормы, якія, магчыма, ужо трэба недзе карэкціраваць. У прыватнасці, гэта датычыцца маёмасных адносін, пытанняў прыватнага бізнесу. Абсалютна правамерна, што сёння пільная ўвага існуе і да пытанняў аховы здароўя, якія датычацца не толькі лячэння, але і рэабілітацыі. Гэта пытанні, пра якія Міністэрства аховы здароўя ведае і ўжо займаецца сістэмай рэабілітацыі, што павінна быць створана як на рэспубліканскім узроўні, так і ў нашых гарадах і раёнах, каб людзі маглі атрымаць кваліфікаваную медыцынскую дапамогу і адаптацыю пасля хваробы, якую яны перанеслі, — абазначыла Наталля Качанава.

Вырашылася і праблема пажылой жанчыны, якая ў 2016 годзе купіла ў Мінску кватэру за суму, эквівалентную 40 тысячам долараў, 30 з якіх яна прыдбала ад продажу сваёй старой кватэры, а 10 тысяч — збірала сама. Кватэру жанчына падарыла свайму непаўналетняму ўнуку. Са снежня 2022-га яе пачала праследаваць падатковы інспектар, і весь ужо дзевяць месяцаў органы правяраюць даходы бабулі, паскардзілася яе дачка, якая прыйшла на прыём разам з маці. Апошняя вельмі хацела асабіста трапіць на прыём да Старшыні Савета Рэспублікі.

— Прычапілася да маёй пенсіі, і я не разумею, чаму. Яна (жанчына з падатковай) не верыць у памер маёй пенсіі, прыслала мне даведку, дзе пенсія ў беларускіх рублях, але ж я атрымліваю расійскую пенсію, бо працавала там. Мы з дачкой паехалі ў Пскоў, атрымалі там даведку, а ў яе ўсё роўна пытанні, — паскардзілася жанчына.

— Мы ўжо сабралі ўсе даведкі, каб паказаць, што яна сама зарабіла ўсе гэтыя грошы і адкуль яна іх узяла, і што на пенсіі працягвала працаваць. Няўжо яна не магла сабраць за жыццё дзесяць тысяч долараў?! Аднак яе вымушаюць заплаціць падаткаў пяць тысяч за кватэру. Цяпер мы яе афіцыйна здаём, — падтрымала маці яе дачка.

У адказ на гісторыю **Ігар СКРЫННІКАЎ, намеснік міністра па падатках і зборах,** папрасіў у жанчыны прабачэння і заўважыў, што падатковая не павінна была распачынаць кантрольныя мерапрыемствы ў дачыненні да яе:

— Такія катэгорыі грамадзян увогуле не павінны трапляць у поле зроку кантролю. Па літары закона ў нас пытанні, вядома, былі. Але іншы момант, што не зусім карэктна нашы патрабаванні былі даведзены да заяўніка, і за гэта выбачаемся.

Наталля Качанава рэзюмавала, што на тым праверкі адносна жанчыны скончыліся, і з падатковай яе больш з такім пытаннем турбаваць не будуць.

— Я са снежня, як усё пачалося, спаць нармальна не магу, а сёння хоць засну спакойна, — з удзячнасцю сказала бабуля.

*З чым яшчэ прыходзілі людзі да спікера верхняй палаты парламента, «Звязда» падрабязна раскажа ў наступным выпуску «Мясцовага самакіравання».*

**Ірына СІДАРОК.**

Парламенцкі дзённік

# НОВЫ ЎЗРОВЕНЬ УЗАЕМАДЗЕЯННЯ

## Намеснік старшыні Палаты прадстаўнікоў Валерый МІЦКЕВІЧ сустрэўся з дэлегацыяй Ніжагародскай вобласці

**У рамках мерапрыемства адбылася цырымонія падпісання пагадненняў аб супрацоўніцтве Брэсцкага, Віцебскага і Гродзенскага абласных Саветаў дэпутатаў з Заканадаўчым сходам Ніжагародскай вобласці.**

Валерый Міцкевіч упэўнены, што падпісаныя пагадненні нададуць далейшы імпульс развіццю двухбаковых сувязяў у шматлікіх сферах. «Гэта забеспячэнне роўных правоў грамадзян, падтрымка айчынных таваравытворцаў, комплекснае развіццё сельскіх тэрыторый і многае іншае, — канкрэтызаваў ён. — Менавіта на рэгіянальным узроўні мы можам бачыць найлепшыя прыклады народнай дыпламатыі ў дзеянні».

«Найярчэйшы прыклад супрацоўніцтва — удзел ніжагародскіх прадпрыемстваў і арганізацый у праектаванні і ўзвядзенні Беларускай АЭС, вялікая колькасць матэрыялаў для якой пастаўлялася з вашай вобласці, — звярнуў увагу Валерый Міцкевіч. — У кароткія тэрміны рэалізаваны яшчэ адзін знакавы беларуска-расійскі праект па вытворчасці трамваяў у Ніжагародскай вобласці. Усяго яго магутнасць дазваляе ствараць каля 170 трамваяў у год. Беларускія прадпрыемствы зацікаўленыя і далей пашыраць вытворчую кааперацыю, актыўна ўдзельнічаць у абнаўленні аўтамабільнага парка, а таксама ліфтавога абсталявання Ніжагародчыны. Таксама мы прапануем свае тэхналогіі ў будаўніцтве і рэканструкцыі малочнатаварных комплексаў як пад ключ, так і ў якасці пастаўшчыкоў абсталявання. Пра гэта ішла гаворка на сустрэчы прэм'ер-міністра Беларусі Рамана Галоўчанкі з вашым губернатарам. Лічу, што дэпутаты ўсіх узроўняў тут могуць падключыцца да вырашэння дадзенай задачы».

На дасягнутым ніхто спыняцца не збіраецца. У сумесных планах — наладжванне перспектыўных кантактаў у сферы прамысловай кааперацыі, інвестыцый, максімальная ўвага пытанням імпартазамяшчэння, пераасначэння прадпрыемстваў, забеспячэнне тэхналагічнага суверэнітэту двух краін. «Такія рэгіянальныя сувязі выводзяць нас на новы ўзровень беларуска-расійскіх адносін, саюзнага будаўніцтва, — рэзюмаваў намеснік старшыні Палаты прадстаўнікоў. — Наша супрацоўніцтва будзе вельмі добрым адказам на санкцыі, палітычны ціск, шантаж з боку калектыўнага Захаду. Разам мы абавязкова выстаім, забяспечым выкананне планаў сацыяльна-эканамічнага развіцця і дастойны ўзровень жыцця нашых грамадзян».

У сваю чаргу, **старшыня Заканадаўчага сходу Ніжагародскай вобласці Яўген ЛЮЛІН** заўважыў, што мэтай візіту з'яўляецца паглыбленне супрацоўніцтва, якое ўжо даўно склалася. «У нас пастаянна павялічваецца аб'ём тавараабароту, сумесная вытворчасць, адкрываем сумесныя прадпрыемствы, толькі ў прамысловай вытворчасці мы падвоілі аб'ёмы за апошнія пяць гадоў, — паведаміў ён. — Палова сельгастэхнікі на палях Ніжагародскай вобласці — беларуская. Ліфты і трамваі ў нас беларускія. Шмат кірункаў, якія за апошнія 25 гадоў актыўна развіваюцца. Мы ўжо навучыліся працаваць разам з нашымі сябрамі-беларусамі па ўсіх кірунках».

Па словах **старшыні Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў Уладзіміра ЦЯРЭНЦЬЕВА,** у першую чаргу ставілася пытанні эканамічнага развіцця рэгіёнаў. «Ніжні Ноўгарад — гэта буйны прамысловы цэнтр, таму мы зацікаўленыя ў супрацоўніцтве з гэтым рэгіёнам, — адзначыў ён. — Складаюць для нас цікавасць і шматлікія кантакты: як на ўзроўні дэпутатаў, так і на ўзроўні моладзі».

Як заўважыла **старшыня Гродзенскага абласнога Савета дэпутатаў Алена ПАСЮТА,** падпісанне пагаднення аб супрацоўніцтве з Ніжагародскай вобласцю — прадукт сумеснай двухгадовай работы. «Прынята рашэнне аб правядзенні з'езда малых гарадоў, — удакладніла яна. — Летась такі з'езд быў на тэрыторыі Ніжагародскай вобласці, сёлета ён адбудзецца на тэрыторыі Гродзеншчыны, непасрэдна ў гарадскім пасёлку Зэльва. Гэта для нас пэўны крок, этап ва ўзаемадзеянні. Далейшая работа будзе накіравана на больш цеснае супрацоўніцтва з заканадаўцамі, развіццё сацыяльна-культурных пытанняў, якія востра стаяць і ў адным, і ў другім рэгіёнах».

**Вераніка КАНЮТА.**


ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5, корп. 2, пом. 1703. УНП 191224638 |
| **Продавец** | ЗАО «Белтехнология и М», г. Минск, пр. Пушкина, д. 70. УНП 100770618. Тел.: +375 29 6139869 |

**Предмет аукциона**

| Лот № | Наименование | Нач. цена (с НДС), дол. США | Шаг аукциона*, дол. США |
|---|---|---|---|
| | **Месторасположение: г. Минск, ул. Притыцкого, 62/ 12** | | |
| 1 | **Ограждение бетонное** (инв. номер 980773) | **900,00** | 45,00 |
| | **Месторасположение: г. Минск, пр-т Пушкина, 70** | | |
| 2 | **Домик-сторожка** (инв. № 2), **ограждение из металлич. сетки** (инв. № 4), **ворота самонесущие с электромех. приводом и калиткой** (инв. № 5), **теплотрасса** (инв. № 30121) | **550,00** | 27,50 |
| 3 | **Аппарат гидроабразив. резки** (инв. № 70103) | **12 500,00** | 625,00 |
| 4 | **Полуав-т для пайки дорож. резцов модели АПЗ-124** (инв. № 70124) | **250,00** | 12,50 |
| 5 | **Полуавтомат для пайки дорож. резцов модели АПЗ-4** (инв. № 41028) | **250,00** | 12,50 |
| 6 | **Робот промыш. KUKA KR 150 со шкафом управления и соединит. кабелями** | **9 500,00** | 475,00 |
| 7 | **Профильный проектор Helios 350H** | **4 000,00** | 200,00 |
| 8 | **Незавершенное пр-во стана поперечно-клиновой прокатки SP-5000-2** | **100 000,00** | 5 000,00 |
| 9 | **Снегоотбрасыватель ST268EP** | **1 220,79** | 61,04 |
| 10 | **Горячекат. легиров. круглый прокат марки 25MoCr4: d 101.6мм x 8809мм – 2436 кг** | **2 600,00** | 130,00 |
| 11 | **Горячекат. легиров. круглый прокат марки 25MoCr4: d 110,0мм x 8790мм – 2 318,49 кг** | **2 600,00** | 130,00 |
| 12 | **Стальные катанные прутки марки 25 MoCr4, 102,00мм – 1 900,00 кг** | **1 300,00** | 65,00 |
| 13 | **Пресс гидравлический «Гефест» 160.02. с гидравлической станцией в комплекте с маслоохладителем HY 2503, б/у** | **92 392,98** | 4 619,65 |
| 14 | **Гидравлический агрегат UHAB-SO1772.0.0, б/у, Гидроцилиндр USJ3KS-35-100/70-1000-4823, б/у, Гидроцилиндр USJ6KS-35-125/70-1350-4824, б/у** | **128 733,50** | 6 436,68 |
| 15 | **Гидробак, 2 т., б/у** | **1 693,88** | 84,70 |
| 16 | **Компрессор Spitzenreiter S-EK050, б/у** | **6 911,61** | 345,58 |
| 17 | **Стан клиновой прокатки SP-2500, б/у** | **92 392,98** | 4 619,65 |
| 18 | **Осушитель LW-60AC, б/у** | **1 072,00** | 53,60 |

**Демонтаж, разборка, погрузка и транспортировка предмета аукциона** проводится за счет покупателя

*Примечание: цена продажи Предмета аукциона фиксируется в протоколе о результатах аукциона в сумме в белорусских рублях, эквивалентной цене продажи лота в долларах США по курсу НБРБ на дату проведения аукциона

**Порядок ознакомления:** в рабочие дня по предварительному согласованию +375 (29) 6139869 Дмитрий

**Порядок оформления участия в аукционе и результатов торгов:** аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи имущества ликвидир. юридич. лица с публич. торгов, утвержденным постановлением Совмина РБ от 8 января 2013 г. № 16 «О некоторых вопросах продажи имущества ликвидир. юридич. лица».
С подробной информацией о перечне предоставляемых документов, образцами заявления на участие в аукционе и договора о задатке, а также правилами проведения аукциона можно ознакомиться на сайте **ipmtorgi.by**

**Задаток 1 %,** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск; БИК BELBBY2X; УНП 191224638; получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка»

**Срок подписания договора купли-продажи – 7 (семь) дней** после проведения аукциона

**Срок оплаты предмета аукциона:** не позднее **7 (семи) календарных дней** со дня проведения аукциона

Победитель аукциона, либо единственный участник, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан возместить затраты на организацию и проведение аукциона, а также оплатить вознаграждение организатору аукциона в размерах, указанных в информации об аукционе на сайте www.ipmtorgi.by, от цены продажи лота в течение 5 (пяти) дней со дня проведения аукциона

Предыдущее извещение по лотам №№ 1–12 опубликовано в газете «Звязда» от 25.07.2023 г.

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

| **Дата и время начала аукциона** | |
|---|---|
| по лотам №№ 1-12: | **09.10.2023 в 13.00,** г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, оф. 5 |
| по лотам №№ 13-18: | **23.10.2023 в 13.00,** г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, оф. 5 |
| **Прием заявок:** | |
| по лотам №№ 1-12: | **06.10.2023 до 17.00,** г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, оф. 5 |
| по лотам №№ 13-18: | **20.10.2023 до 17.00,** г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, оф. 5 |

**Контактные телефоны: +375 17-280-36-37; +375 44-704-92-06.**
**E-mail: auction@ipmconsult.by**

**ООО «Юридическая компания Аспект»**
**проводит первые повторные торги в форме открытого аукциона по продаже имущества ликвидируемого юридического лица – ООО «ЭнергоХорс»**

Перечень лотов, размер начальных цен, шага торгов, задатка для участия в торгах, а также условия проведения торгов размещены на сайте ООО «Юридическая компания Аспект» – «aspekt-avs.by» в разделах «Актуальные аукционы. Лоты на реализации. Транспортные средства. Прочее оборудование» по ссылке «https://aspekt-avs.by/aykciony_info/»

*Торги назначены на **03.10.2023 г. в 10.30** по адресу: **г. Минск, ул. Тимирязева, д. 65, оф. 401, холл (4-й этаж)**. Срок приема заявок, внесения задатка для участия в торгах – до **29.09.2023 г.** включительно. Заявки принимаются организатором торгов по месту проведения торгов в рабочие дни с 9.00 до 17.30 (по пятницам – до 16.30)*

| | |
|---|---|
| Продавец | **ООО «ЭнергоХорс», УНП 192193863** |
| Организатор торгов | **ООО «Юридическая компания Аспект»** |
| Реквизиты для оплаты задатка | **ООО «Юридическая компания Аспект», р\с в BYN № BY05TECN30120738300060000000, ОАО «Технобанк», г. Минск, БИК TECNBY22, УНП 191366886** |

Получить дополнительную информацию о порядке проведения торгов можно по телефонам: +375 (44) 5986627, 8 (017) 3480699 в рабочие дни с 9.00 до 17.30 (по пятницам – до 16.30). Ознакомиться с предметом торгов возможно по месту нахождения имущества, после предварительного согласования по тел. +375 (44) 5986627. *Объявление о предыдущих торгах опубликовано в газете «Звязда» за 20.05.2023 г. (стр. 10)*